УДК 63:37:633/635-057.8«1911–1914»(476)

***Сяргей Віктаравіч Мяньчэня***
*ст. выкладчык каф. сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта,*
*ст. навуковы супрацоўнік аддзела даследчыцкай і навукова-метадычнай дзейнасці*
*Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі імя І. С. Лупіновіча*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Siarhei Mianchenya***
*Senior Lecturer at the Department of Social and Humanitarian Disciplines*
*of the Belarusian State Agrarian Technical University,*
*Senior Researcher at the Department of Research, Scientific and Methodological Activity*
*of the I. S. Lupinovich Belarus Agricultural Library of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: menchenia@gmail.com

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ І ГРАМАДСКІХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ АГРАНАМІЧНЫМ ПЕРСАНАЛАМ НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*Аналізуюцца працэсы, звязаныя з ростам кольскасці агранамічнага персанала дзяржаўных і грамадскіх устаноў беларускіх губерняў у 1911–1914 гг. Вызначаецца яго функцыянал і спецыялізацыя, адукацыйны цэнз і стаж працы, разглядаецца стан сельскагаспадарчай адукацыі. Агранамічны персанал колькасна значна павялічыўся, што было звязана як з агульнадзяржаўнай тэндэнцыяй, так і з мясцовымі асаблівасцямі (увядзенне земстваў). У той жа час колькасны рост адбываўся ў некаторых выпадках за кошт значнага павялічэння ніжэйшага персанала. Стрымліваючым фактарам для колькаснага і якаснага росту агранамічнага персанала з’яўлялася сітуацыя з сельскагаспадарчай адукацыяй: навучальныя ўстановы беларускіх губерняў, акрамя Горацкіх вучылішчаў, давалі магчымасць набыцця толькі пачатковага ўзроўню. Пераважная большасць гэтых устаноў была створана і фінансавалася грамадскімі арганізацыямі і прыватнымі асобамі, а каля 1/3 з сельскагаспадарчых школ пачалі працу толькі ў 1914 г.*

***Ключавыя словы:*** *агранамічны персанал, сельскагаспадарчая спецыялізацыя, сельскагаспадарчая адукацыя.*

## *Supply of State and Public Institutions of Belarusian Governorates with Agronomic Personnel on the Eve of the First World War*

*The article analyzes the processes related to the growth in the number of agronomic personnel of state and public institutions of Belarusian governorates in 1911–1914. Its functionality and specialization, educational qualification and work experience are determined, the state of agricultural education is considered. The agronomic personnel increased significantly in terms of quantity, which was associated with both the national trend and local characteristics (introduction of zemstva). At the same time, the quantitative growth occurred in some cases due to a significant increase in the number of junior personnel. A restraining factor for the quantitative and qualitative growth of the agronomic personnel was the situation with agricultural education: educational institutions of the Belarusian governorates, except for Horatsky specialized schools, gave the opportunity to acquire only elementary level. The vast majority of these institutions were established and financed by public organizations and private individuals, while about 1/3 of the agricultural schools began work only in 1914.*

***Key words:*** *agronomic personnel, agricultural specialization, agricultural education.*

### Уводзіны

Асновай эканомікі беларускіх губерняў Расійскай імперыі пачатку XX ст. была сельская гаспадарка. На 1 студзеня 1914 г. вясковае насельніцтва Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў складала 9 746 тыс. чалавек, на яго прыходзілася 5 035 тыс. дзесяцін ворыўнай зямлі; у значнай ступені з сельскай гаспадаркай быў звязаны і прамысловы сектар [1, с. 518]. Менавита таму кіраванню і мадэрнізацыі сельскагаспадарчай галіны павінна была надавацца асаблівая ўвага.

Аб’ектам даследавання ў артыкуле з’яўляецца агранамічны персанал звязаных з сельскай гаспадаркай дзяржаўных і грамадскіх устаноў. Дзяржаўныя ўстановы падпарадкоўваліся Дэпартаменту земляроб-

ства і фінансаваліся з бюджэта, грамадскія знаходзіліся ў падпарадкаванні ў земстваў (калі яны былі), а таксама былі прадстаўлены таварыствамі сельскай гаспадаркі.

**Колькасны склад агранамічнага персаналу**

З 1911 г. да 1914 г. колькасць агранамічнага персаналу беларускіх губерняў вырасла ў 5 разоў. Пры гэтым рост у грамадскіх установах быў у 9 разоў, што звязвалася з актывізацыяй дзейнасці мясцовых таварыстваў сельскай гаспадаркі і ўвядзеннем земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях (табліца 1). Калі ў 1911 г. суадносіны грамадскага і дзяржаўнага персанала складалі 1:2,8, то ў 1914 г. – 1:1,7.

Табліца 1. – Дынаміка колькасці агранамічнага персаналу ў беларускіх губернях у 1911–1914 гг. [1, с. 512; 2, с. 214; 3, с. 300; 4, с. 406]

| Год | Губерня | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | | Віцебская | | Гродзенская | | Мінская | | Магілёўская | |
| | *a* | *b* | *a* | *b* | *a* | *b* | *a* | *b* | *a* | *b* |
| 1911 | 17 | 1 | 29 | 11 | 14 | – | 12 | 16 | 18 | 4 |
| 1912 | 27 | 4 | 44 | 19 | 35 | 10 | 26 | 13 | 43 | 6 |
| 1913 | 42 | 5 | 55 | 61 | 54 | 7 | 37 | 38 | 63 | 22 |
| 1914 | 60 | 11 | 78 | 120 | 55 | 38 | 54 | 71 | 86 | 48 |

*Заўвага. – a – дзяржаўныя ўстановы, b – грамадскія ўстановы.*

На 1 студзеня 1914 г. агранамічны персанал дзяржаўных і грамадскіх устаноў беларускіх губерняў складаў 621 чалавек, што адпавядала 8 % ад агульнарасійскага паказчыка (табліца 2).

Табліца 2. – Агранамічны персанал беларускіх губерняў на дзяржаўнай і грамадскай службе на 1 студзеня 1914 г. [1, с. 512]

| | Губерня | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская |
| | Дзяржаўныя ўстановы | | | | |
| Інспектары сельскай гаспадарцы і ўрадавыя аграномы | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| Аграномы землеўпарадкавальнай камісіі | 14 | 23 | 11 | 9 | 12 |
| Сельскагаспадарчыя старасты | 15 | 24 | 30 | 28 | 56 |
| Спецыялісты | 3 | 7 | 2 | 2 | 5 |
| Інструктары | 26 | 22 | 9 | 13 | 11 |
| Загадчыкі сельскагаспадарчымі складамі | – | – | 1 | – | – |
| Усяго | 60 | 78 | 55 | 54 | 86 |
| | Грамадскія ўстановы | | | | |
| Губернскія аграномы і іх памочнікі | – | 1 | – | 1 | 1 |
| Павятовыя аграномы | – | 1 | – | 3 | 3 |
| Загадчыкі агранамічнай справай і сакратары сельскагаспадарчых таварыстваў | 2 | 9 | 3 | 5 | 2 |
| Участковыя аграномы | – | 18 | – | 10 | 16 |
| Сельскагаспадарчыя старасты | – | 26 | – | 17 | 14 |
| Спецыялісты | – | – | 1 | 1 | – |
| Інструктары | 5 | 52 | 22 | 15 | 5 |
| Загадчыкі сельскагаспадарчымі складамі | 1 | 13 | 7 | 16 | 7 |
| Загадчыкі вопытнымі гаспадаркамі | 3 | – | 5 | 3 | – |
| Усяго | 11 | 120 | 38 | 71 | 48 |
| Разам па губерні | | | | | |
| | 71 | 198 | 93 | 125 | 134 |

На ўтрыманне і дзейнасць дадзенага персаналу выдаткоўвалася 712 305 руб. Суадносіны выдаткаў бюджэту і грамадскіх устаноў складалі 55,7 % (397 075 руб.) і

44,3 % (315 230 руб.) пры колькасных суадносінах персаналу 53,6 і 46,4 % адпаведна. На аднаго чалавека ў сярэднім прыходзілася 1 147 руб., пры гэтым на дзяржслужачага – 1 192 руб., а служачага грамадскай установы – 1 094 руб. Асобна па губерням на аднаго спецыяліста найбольш выдаткоўвалася ў Віленскай губерні (1 338 руб.), найменш – у Мінскай (1 050 руб.) [1, с. 518–519].

На аднаго спецыяліста ў беларускіх губернях прыходзілася ў сярэднім 17 445 чалавек, пры гэтым дадзены паказчык у Віленскай і Віцебскай губернях адрозніваўся ў 3 разы (24 483 і 8 063 чалавек адпаведна). Сярэдні паказчык па Расійскай імперыі – 13 767 чалавек – перавышалі ўсе беларускія губерні, акрамя Віцебскай (Гродзенская – 17 700, Магілёўская – 15 837, Мінская – 21 144). У той жа час у беларускіх губернях на аднаго спецыяліста прыходзілася 9 017 дзесяцін зямлі пры сярэднім па імперыі паказчыку ў 9 934. Найменш зямлі прыходзілася на агранамічны персанал Віцебскай губерні (4 288 дзесяцін), найбольш – у Мінскай і Віленскай губернях (10 034 і 14 123 дзесяцін адпаведна) [1, с. 518–519].

**Структура кіравання і функцыянал**

У губернях кіраўніцтва агранамічным персаналам дзяржаўных і грамадскіх устаноў ажыццяўлялася ўрадавымі аграномамі (ці інспектарамі сельскай гаспадаркі) і губернскімі аграномамі адпаведна. Разам з тым трэба адзначыць, што калі функцыянал і паўнамоцтвы першых былі канкрэтна вызначаны законам, то роля і палажэнне агранамічнага персаналу грамадскіх устаноў адрозніваліся ў залежнасці ад губерні [5, с. 158]. Сярод абавязкаў інспектараў сельскай гаспадаркі былі наступныя: ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў сферы сельскай гаспадаркі і выкананне даручэнняў Міністэрства земляробства; удзел і кантроль за мерапрыемствамі, накіраванымі на развіццё сельскай гаспарадкі, якія ажыццяўляліся дзяржавай, мясцовымі ўстановамі і прыватнымі асобамі; вывучэнне стану сялянскіх і памешчыцкіх гаспадарак і перадача інфармацыі аб іх патрэбах і праблемах у цэнтральныя органы; удзел у аперацыях па крэдытаванні сельскай гаспадаркі і мерапрыемствах па развіцці саматужнай вытворчасці.

Сярэдні персанал быў прадстаўлены ў дзяржаўных установах аграномамі землеўпарадкавальнай камісіі, спецыялістамі і інструктарамі. Апошнія дзве катэгорыі падзяляліся таксама на старэйшых і малодшых.

У абавязкі спецыялістаў і інструктараў уваходзіла: наведванне гаспадарак (як памешчыцкіх, так і сялянскіх) па запыту іх уладароў і правядзенне кансультацый па сельскагаспадарчых пытаннях; збор даных аб стане асобных галін сельскай гаспадаркі; выкананне даручэнняў па правядзенні на месцах урадавых мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне тэхнікі сельскай гаспадаркі; удзел у барацьбе са шкоднымі жывёламі, насякомымі і раслíннымі паразітамі [5, с. 135].

Найлепшыя паказчыкі ў забеспячэнні сярэднім агранамічным персаналам мелі Віленская (47 % ад усяго персаналу), Віцебская (36 %) і Гродзенская (36 %) губерні [1, с. 14–28, 80–85, 184–197]. Сфера дзейнасці інструктараў і спецыялістаў дапамагае вызначыць сельскагаспадарчую спецыялізацыю губерняў. З 1890-х гг. галоўнай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі стала малочная жывёлагадоўля, што найбольш праявілася ў гаспадарках Мінскай, Віленскай і Віцебскай губерняў [6, с. 74–75]. Менавіта спецыялісты, што працавалі ў гэтай сферы (жывёлагадоўля, малочная гаспадарка, культура кармавых раслін, масларобства) пераважалі ў дадзеных губернях. Так, у Віцебскай губерні яны складалі 39 % сярэдняга персаналу. Пэўную сувязь з малочнай жывёлагадоўляй мела меліярацыйная справа: землі, што ўводзіліся ў сельскагаспадарчы зварот найчасцей выкарыстоўваліся для травасеяння, якое спрыяла паляпшэнню кармавой базы. Спецыялісты па культуры балот і лугаводству былі прадстаўлены ва ўсіх губернях, аднак найбольш у Мінскай – 15 чалавек. Трэцюю па колькасці групу складалі спецыялісты ў сферы садаводства (найбольш у Віцебскай (21 чалавек) і Віленскай (9 чалавек) губернях). У апошняй гэтыя асобы мелі дачыненне і да пчалярства. Па адным спецыялісту-пчаляру працавала ў Мінскай і Гродзенскай губернях. Льнаводства было прадстаўлена ў Віцебскай і Магілёўскай губернях (7 і 1 чалавек адпаведна). Па перапрацоўцы садавіны і агародніны значыўся толькі адзін спецыяліст – у Віцебскай губерні [1, с. 14–28, 80–85, 184–197].

У сістэме земскай агранамічнай службы прысутнічалі павятовыя аграномы, ці

ўчастковыя, пры гэтым павет павінен быць падзелены на зоны адказнасці. Але дадзеная сістэма на тэрыторыі беларускіх губерняў яшчэ не атрымала шырокага распаўсюджвання. Калі ў Віцебскай губерні ўчастковая сістэма была ўведзена ва ўсіх паветах, а колькасць участкаў складала 48, то ў Мінскай і Магілёўскай губернях – толькі ў 6 з 9 і 5 з 12 паветаў адпаведна; пры гэтым колькасць участкаў была аднолькавая – па 14 [5, с. 169].

Да ніжэйшага персаналу адносіліся сельскагаспадарчыя старасты і загадчыкі сельскагаспадарчымі складамі. Яны часта выбіраліся з ліку сялян і не мелі адпаведнай адукацыі. Пэўным выключэннем быў загадчык склада Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі Вацлаў Іваноўскі (1880–1943) [1, с. 14]. Ён скончыў Тэхналагічны універсітэт у Пецярбургу, у 1909 г. атрымаў ступень доктара тэхнічных навук у Мюнхенскім політэхнічным інстытуце, спецыялізаваўся ў галіне ферментацыі харчовых прадуктаў. Да пераезду з Пецярбурга ў Вільню займаўся выкладчыцкай дзейнасцю, быў старшым кансультантам па перапрацоўцы садавіны пры Дэпартаменце земляробства [7, с. 77]. Фактычна пасада загадчыка склада з'яўлялася для В. Іваноўскага своеасаблівым прыкрыццём яго грамадска-палітычнай і асветніцкай дзейнасці.

### Працоўны стаж і адукацыйны цэнз персаналу

Ратацыя кадраў і стварэнне новых вакансій уплывалі на працоўны стаж спецыялістаў. З 621 чалавека пяць і больш гадоў свае пасады займалі толькі 20, ці 3,2 %: у Віцебскай губерні 9 чалавек, Гродзенскай – 5, Магілёўскай – 3, Мінскай – 2, Віленскай – 1. Больш за астатніх на сваіх пасадах працавалі інструктар па садаводстве і агародніцтве Васіль Галкін з Дрысы Віцебскай губерні (16 гадоў) і інструктар па садаводстве пры Мінскім таварыстве сельскай гаспадаркі Вацлаў Рыбскі (13 гадоў) [1, с. 12, 185].

Па ўзроўні адукацыі агранамічны персанал падзяляўся на чатыры групы: вышэйшая, сярэдняя, пачатковая і хатняя адукацыя. Найбольш спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (17 чалавек, або 24 %) было ў Віленскай губерні, пры гэтым сярод дзяржаўных служачых іх доля складала 18,3 %, сярод служачых грамадскіх устаноў – 54,5 %. У Віцебскай губерні аналагічныя паказчыкі складалі: 28 чалавек, ці 14,1 % (23 і 8,3 %), Гродзенскай – 21, ці 21,4 % (23,6 і 21 %), Мінскай – 26, ці 20,8 % (24 і 18,3 %), Магілёўскай – 13, ці 9,7 % (9,3 і 10,4 %). Нізкія паказчыкі Магілёўскай губерні абумоўлены значнай колькасцю сельскагаспадарчых стараст, аднак спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй тут не былі забяспечаны 7 з 11 паветаў (Быхаўскі, Горацкі, Клімавіцкі, Мсціслаўскі, Рагачоўскі, Чавускі і Чэрыкаўскі). Не мелі кадраў з вышэйшай адукацыяй таксама дзяржаўныя і грамадскія ўстановы Вілейскага, Віленскага і Дзісненскага паветаў Віленскай губерні, Веліжскага павета Віцебскай губерні, Пружанскага павета Гродзенскай губерні і Барысаўскага павета Мінскай губерні [1, с. 14–28, 80–85, 184–197].

Больш за ўсё спецыялістаў з хатняй адукацыяй працавала ў Гродзенскай губерні – 22 чалавеі, ці 23,6 %, пры гэтым 16 з іх знаходзіліся на дзяржаўнай службе. У астатніх губернях колькасць спецыялістаў гэтай катэгорыі была нязначнай: у Віленскай 1 (1,4 %), Віцебскай – 6 (3 %), Мінскай – 4 (3,2 %), Магілёўскай – 6 (4,4 %). Высокія паказчыкі Гродзенскай губерні можна патлумачыць асаблівасцямі структуры персаналу: сельскагаспадарчыя старасты (ніжэйшае звяно) складалі тут 32 % [1, с. 14–28, 80–85, 184–197]. Уплываў на гэтую сітуацыю канфесійны склад насельніцтва: значная колькасць каталікоў атрымлівала адукацыю па-за дзяржаўнымі пачатковымі навучальнымі ўстановамі.

### Падрыхтоўка кадраў

Падрыхтоўкай агранамічнага персаналу Расійскай імперыі, паводле інфармацыі Галоўнага ўпраўлення земляробства і землеўпарадкавання, да 1914 г. займаліся 9 вышэйшых навучальных устаноў, 18 сярэдніх сельскагаспадарчых вучылішчаў і 341 сельскагаспадарчая школа [8, с. 154]. На тэрыторыі пяці беларускіх губерняў у сярэдзіне 1914 г. размяшчаліся 37 навучальных устаноў (разам з пастаяннымі курсамі), якія падпарадкоўваліся Дэпартаменту земляробства і былі размеркаваны наступным чынам: Віленская губерня – 6 устаноў (Варанецкае пачатковае вучылішча, Гедройцкая жаночая практычная школа, Нарвелішскія жаночыя сельскагаспадарчыя класы,

Гараднянская ніжэйшая школа II разраду, Віленская практычная школа садаводства, Вольгіеўскі прыют для дзяцей абодвух палоў (практычнае навучанне садаводству)); Віцебская губерня – 8 устаноў (Лужаснянскае пачатковае вучылішча, Себежская ніжэйшая школа II разраду, Грэйшканская ніжэйшая пачатковая школа, Кокарэўская ніжэйшая народная школа, Рэкаўская ніжэйшая пачатковая школа, Ільінска-Крэстоўская ніжэйшая народная школа, Хрусцелеўская ніжэйшая школа II разраду малочнай гаспадаркі, курсы пчалярства пры вучэбна-паказальнай пасецы Руткоўскага); Гродзенская губерня – 3 установы (Краснастокскае жаночае ніжэйшае вучылішча, Ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча мясцовага дваранства, Азерніцкая ніжэйшая пачатковая школа); Мінская губерня – 5 устаноў (Мар'іна-Горкаскае пачатковае вучылішча, Мінскае культурна-тэхналагічнае пачатковае вучылішча, Малаплотніцкая і Палкоцічская ніжэйшыя пачатковыя школы, Азарычская ніжэйшая народная школа); Магілёўская губерня – 15 устаноў (Горыцкія сярэднія сельскагаспадарчае і землямерна-агранамічнае вучылішчы, Горацкае сельскагаспадарчарамеснае пачатковае вучылішча, Смалянскае пачатковае вучылішча, Рачкоўская і Чурылаўская сельскагаспадарча-рамесныя ніжэйшыя школы II разраду, Доўская і Чачэрская ніжэйшыя пачатковыя школы, Чарнеўская ніжэйшая народная школа, Сафіеўская жаночая ніжэйшая школа жывёлагадоўлі, масларобства і сыраварэння II разраду, Зіноўеўская ніжэйшая практычная школа садовых рабочых, Ляўкоўская ніжэйшая практычная школа жывёлагадоўлі, курсы садовых рабочых пры ферме Горыцкага сельскагаспадарчага вучылішча, курсы па агародніцтве і садаводстве пры Магілёўскім епархіяльным вучылішчы, практычнае навучанне садаводству пры Таварыстве дапамогі бедным Магілёўскай губерні для дзяцей абодвух палоў) [5, дадатак 1, с. 2–4, 8, 9].

Такім чынам, вышэйшыя навучальныя ўстановы на тэрыторыі беларускіх губерняў адсутнічалі, а падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй ажыццяўлялі толькі Горацкія навучальныя ўстановы. Да 1912 г. былі створаны 19 сельскагаспадарчых навучаль-ных устаноў (51 %), у 1914 г. пачалі працу 12 (32,4 %). Пераважная колькасць гэтых устаноў была створана і фінансавалася прыватнымі асобамі ці грамадскімі арганізацыямі (табліца 3).

Табліца 3. – Навучальныя ўстановы беларускіх губерняў, падпарадкаваныя Дэпартаменту земляробства (1914 г.) [5, дадатак 1, с. 2–4, 8, 9]

| Губерня | Прыватныя | Казённыя | Земскія | Грамадскія | Манастырскія |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленская | 4 | – | – | 2 | – |
| Віцебская | 2 | – | 2 | 4 | – |
| Гродзенская | 1 | 1 | – | – | 1 |
| Мінская | – | 1 | 4 | – | – |
| Магілёўская | 4 | 4 | 5 | 2 | – |
| Разам | 11 | 6 | 11 | 8 | 1 |

**Удзел жанчын у агранамічнай справе**

Агранамічная адукацыя ў Расійскай імперыі, а тым больш і дзяржаўная служба, лічылася мужчынскай справай. Жанчыны часта сутыкаліся з перашкодамі як псіхалагічнага, так і бюракратычнага характару. У значнай ступені рост колькасці жанчын сярод агранамічнай службы быў звязаны з дзейнасцю земскіх устаноў і сельскагаспадарчых таварыстваў [9, с. 92]. На тэрыторыі беларускіх губерняў атрымаць сельскагаспадарчую адукацыю жанчыны маглі ў шасці навучальных установах, аднак, калі ўлічваць спецыфіку некаторых з іх (Краснастоцкі жаночы манастыр, навучанне дзяцей у Вільні і Магілёве) даступнымі для шырокага кола жадаючых заставаліся толькі тры.

Пры вызначэнні з ліку агранамічнага персаналу беларускіх губерняў колькасці жанчын трэба ўлічваць фактар неаднастайнага пазначэння імён ў даведніку «Местный агрономический персонал…», у выніку чаго ў некаторых выпадках адназначна вызначыць пол немагчыма. Упэўнена можна узгадаць пяць жаночых прозвішчаў: Яніна Шчука, кантралёр-асістэнт Брэсцкага сельскагаспадарчага таварыства, Г. Замбржыцкая, кантралёр-асістэнт Гродзенскага сельскагаспадарчага таварыства, Казіміра Зданоўская, сакратар Ваўкавыскага сельскагаспа-

дарчага таварыства, Марта Юнгер і Зінаіда Карманава, спецыяліст па жывёлагадоўлі і інструктар па малочнай гаспадарцы Магілёўскай губерні [1, с. 81, 82, 191].

**Заключэнне**

Такім чынам, напярэдадні Першай сусветнай вайны агранамічны персанал грамадскіх і дзяржаўных устаноў беларускіх губерняў значна павялічыўся ў колькасным плане, што было звязана як з агульнадзяржаўнай тэндэнцыяй, так і з мясцовымі асаблівасцямі (увядзеннне земстваў). Асабліва значны рост паказаў персанал грамадскіх устаноў, які колькасна пераважаў над дзяржаўным у Віцебскай і Мінскай губернях. У той жа час колькасны рост адбываўся ў некаторых выпадках за кошт значнага павелічэння ніжэйшага персаналу, як ў Магілёўскай губерні.

Прафесійная дзейнасць сярэдняга звяна – інструктараў і спецыялістаў – была абумоўлена сельскагаспадарчай спецыялізацыяй рэгіёну і звязана з мяса-малочнай галіной і меліярацыяй. Перашкаджала колькаснаму і якаснаму росту агранамічнага персаналу сітуацыя з сельскагаспадарчай адукацыяй: навучальныя ўстановы ў беларускіх губернях, акрамя Горацкіх вучылішчаў, давалі магчымасць набыцця толькі пачатковага ўзроўню. Пераважная колькасць гэтых устаноў была створана і фінансавалася грамадскімі арганізацыямі і прыватнымі асобамі, пры гэтым каля 30 % сельскагаспадарчых школ пачалі працу толькі ў 1914 г.

Сельскагаспадарчая адукацыя і дзяржаўная і грамадская служба заставаліся мужчынскай справай, а ўдзел у ёй жанчын фактычна быў абмежаваны.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Местный агрономический персонал, состоявший на правительственной и общественной службе 1 января 1914 г. : справочник / сост. Н. А. Александровским, М. М. Глуховым, Н. Ф. Щербаковым ; под ред. В. Н. Штейна. – Петроград : Тип. В. Ф. Киршбаума, 1914. – 576 с.
2. Местный агрономический персонал, состоявший на правительственной и общественной службе 1 января 1911 г. : справочник / сост. Н. А. Александровским, Н. Ф. Щербаковым ; под ред. В. Н. Штейна. – СПб. : Тип. В. Ф. Киршбаума, 1911. – 242 с.
3. Местный агрономический персонал, состоявший на правительственной и общественной службе 1 января 1912 г. : справочник / сост. Н. А. Александровским, Н. Ф. Щербаковым ; под ред. В. Н. Штейна. – СПб. : Тип. В. Ф. Киршбаума, 1912. – 340 с.
4. Местный агрономический персонал, состоявший на правительственной и общественной службе 1 января 1913 г. : справочник / сост. Н. А. Александровским, М. М. Глуховым, Н. Ф. Щербаковым ; под ред. В. Н. Штейна. – СПб. : Тип. В. Ф. Киршбаума, 1913. – 415 с.
5. Агрономическая помощь в России / под ред. В. В. Морачевского. – Петроград : Деп. земледелия, 1914. – 653 с.
6. История аграрной науки Беларуси (XIX – начало XXI в.) : в 2 ч. / В. Г. Гусаков [и др.] ; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2017. – Ч. 1. – 310 с.
7. Туронак, Ю. Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі / Ю. Туронак. – Мінск : Медысонт, 2006. – 180 с.
8. Есикова, М. М. Сельскохозяйственное образование в России (вторая половина XIX в. – 1917 г.) / М. М. Есикова // Власть. – 2010. – № 7. – С. 150–154.
9. Елина, О. Ю. Дамы в полях: образование и карьера первых женщин-агрономов (конец XIX – начало XX в.) / О. Ю. Елина // Ист.-биол. исслед. – 2018. – Т. 10, № 2. – С. 67–99.


REFERENCES


1. Miestnyj agronomichieskij piersonal, sostojavshij na pravitiel’stviennoj i obshchiestviennoj sluzhbie 1 janvaria 1914 g. : spravochnik / sost. N. A. Alieksandrovskim, M. M. Glukhovym, N. F. Shchierbakovym ; pod ried. V. N. Shtejna. – Pietrograd : Tip. V. Kirshbauma, 1914. – 576 s.
2. Miestnyj agronomichieskij piersonal, sostojavshij na pravitiel’stviennoj i obshchiestviennoj sluzhbie 1 janvaria 1911 g. : spravochnik / sost. N. A. Alieksandrovskim, N. F. Shchierbakovym ; pod ried. V. N. Shtejna. – SPb. : Tip. V. Kirshbauma, 1911. – 242 s.

3. Miestnyj agronomichieskij piersonal, sostojavshij na pravitiel'stviennoj i obshchiestviennoj sluzhbie 1 janvaria 1912 g. : spravochnik / sost. N. A. Alieksandrovskim, N. F. Shchierbakovym ; pod ried. V. N. Shtejna. – SPb. : Tip. V. Kirshbauma, 1912. – 340 s.

4 Miestnyj agronomichieskij piersonal, sostojavshij na pravitiel'stviennoj i obshchiestviennoj sluzhbie 1 janvaria 1913 g. : spravochnik / sost. N. A. Alieksandrovskim, M. M. Glukhovym, N. F. Shchierbakovym ; pod ried. V. N. Shtejna. – SPb. : Tip. V. Kirshbauma, 1913. – 415 s.

5. Agronomichieskaja pomoshch' v Rossii / pod ried. V. V. Morachievskogo. – Pietrograd : Diep. ziemliedielija, 1914. – 653 s.

6. Istorija agrarnoj nauki Bielarusi (XIX – nachalo XX v.) : v 2 ch. / V. G. Gusakov [i dr.] ; riedkol.: V. G. Gusakov (gl. ried.) [i dr.]. – Minsk : Bielarus. navuka, 2017. – Ch. 1. – 310 s.

7. Turonak, Yu. Vaclau Ivanouski i adradzhennie Bielarusi / Yu. Turonak. – Minsk : Medysont, 2006. – 178 s.

8. Yesikova, M. M. Siel'skokhoziajstviennoje obrazovanije v Rossii (vtoraja polovina XIX v. – 1917 g.) / M. M. Yesikova // Vlast'. – 2010. – № 7. – S. 150–154.

9. Yelina, O. Yu. Damy v poliakh: obrazovanije i kar'jera piervykh zhenshchin-agronomov, koniec XIX – nachalo XX v. / O. Yu. Yelina // Ist.-biolog. isslied. – 2018. – T. 10, № 2. – S. 67–99.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 16.09.2022*